# З ЦІКАЎНАСЦЮ ДА РОДНАГА СЛОВА

Напрыканцы верасня на філалагічным факультэце адбылося першае ў гэтым навучальным годзе пасяджэнне студэнцкага навуковага гуртка «Мова ў кантэксце культуры», які дзейнічае пры кафедры беларускага мовазнаўства. З назвы гуртка вынікае, што мова разглядаецца ў цеснай узаемасувязі з культурай: гурткоўцы знаходзяць навуковае абгрунтаванне таго, як беларуская мова захавала ў сабе звесткі пра традыцыі, гісторыю, ментальнасць нашага народа, а таксама развіваюць іншыя напрамкі сучаснага мовазнаўства.

На першых занятках мы абмеркавалі памятныя дні 2016 года (узгадалі слынных дзеячаў-юбіляраў Яфіма Карскага, Яна Чачота, Генадзя Бураўкіна, Максіма Багдановіча і інш.), прасачылі ролю студэнцкіх навуковых гурткоў у развіцці мовы – ад філаматаў да сённяшніх навуковых аб'яднанняў у розных ВНУ. Правялі анкетаванне, пасля якога вырашылі чаргаваць разнастайныя формы дзейнасці гуртка: заслухоўванне дакладаў студэнтаў і выкладчыкаў, сустрэчы з вучонымі, знаёмства з навінкамі літаратуры, экскурсіі, наведванне музеяў і навучальных устаноў.

Удзел у рабоце гуртка, безумоўна, будзе карысным для кожнага: тут ёсць магчымасць развіць навыкі навуковага даследавання, а таксама пашырыць свае веды пра родную мову і культуру. Таму запрашаем вас на нашыя пасяджэнні!

**Кацярына ПІВАВАР,**
**староста навуковага гуртка «Мова ў кантэксце культуры».**